местной работы над заданием, обсуждением результатов у студентов формируются необходимые им навыки как устной (диалогической и монологической), так и письменной речи;

методического плана. Метод работы в команде позволяет реализовать на практике наиболее актуальные из существующих сегодня в преподавании иностранных языков подходы: коммуникативный и лингвострановедческий.

Следует отметить, что, в отличие от широко применяемой на занятиях по иностранному языку работы в малых группах, направленной на единовременное выполнение конкретного учебного задания, работа в команде характеризуется наличием долгосрочной цели в рамках совместно разработанного проекта. Примером такого проекта для студентов экономических специальностей может быть деловая игра «Выбор лучшего кандидата на должность». Мы разработали и применили данную разработку на втором курсе. Данная деловая игра позволяет реализовать следующие дидактические цели: совершенствование навыков диалогической речи с использованием речевых клише, развитие монологической речи и навыков аудирования, а также овладение навыками оформления деловой корреспонденции (сопроводительное письмо, CV).

Деловая игра предполагает 4 этапа: информационно-теоретический (сообщение темы и цели игры, исходная информация о ходе игры); организационный (распределение ролей между участниками, деление студентов на группы, выбор экспертов); деловой (выбор лучшего кандидата, телефонный разговор, написание сопроводительного письма-образца), подведение итогов (определение команды-победительницы, анализ игры и самооценка).

http://edoc.bseu.by/

***М.І. Бажкова, І.І. Навасельцава,*** *БДЭУ (Мінск)*

## АБ ПРАЕКЦЕ ВУЧЭБНАГА ДАПАМОЖНІКА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ-ЭКАНАМІСТАЎ

Як вядома, адным з фактараў павышэння ўзроўню матывацыі навучання мове спецыяльнасці з'яўляецца метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу з улікам профілю навучання і будучай спецыяльнасці. Вельмі актуальнай застаецца праблема, звязаная з забеспячэннем падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі на беларускай мове, якія б задавальнялі запатрабаванні сучаснай лінгвіс-

тыкі, спрыялі фарміраванню і ўдасканаленню камунікатыўных уменняў, лексічных і граматычных навыкаў, а галоўнае — вырашалі праблему навучання беларускай мове менавіта як мове будучай спецыяльнасці.

Варыянтам кардынальна новага, рацыянальнага падручніка з улікам спецыфікі БДЭУ, камунікатыўных патрэб навучэнцаў, тэматычнай арганізацыі моўнага матэрыялу якраз і будзе вучэбны дапаможнік «Беларуская мова для студэнтаў-эканамістаў: правілы, практыкаванні, заданні, тэксты, тэсты, кантрольныя работы», які рыхтуецца ў адпаведнасці з «Праграмай па беларускай мове», зацверджанай кафедрай беларускай і рускай моў. Мэта дапаможніка — сістэматызацыя і паглыбленне ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў па беларускай мове, фарміраванне ў будучых эканамістаў моўнай і маўленчай дасведчанасці ў сферы абранай спецыяльнасці.

Дапаможнік будзе складацца з раздзелаў навукі аб мове («Фанетыка і арфаграфія», «Словаўтварэнне», «Марфалогія», «Пунктуацыя», «Стылістыка») і «Дадатка» (слоўнік эканамічных тэрмінаў, слоўнік цяжкіх для напісання слоў і словазлучэнняў, тэксты для перакладу і пераказу, тэсты і ключы да іх, кантрольныя работы). Цэласнаму засваенню правілаў, што дзейнічаюць у сучаснай пісьмовай практыцы, асэнсаванню заканамернасцяў і ўзаемасувязяў асобных іх пунктаў будзе спрыяць сістэматызаваная (у выглядзе апорных табліц і схем з каментарыямі, заўвагамі і тлумачэннямі) падача матэрыялу ў кожным з раздзелаў. Тэарэтычныя палажэнні праілюструюцца на вялікім фактычным матэрыяле з улікам прафесійнай арыентацыі студэнтаў.

У кожным раздзеле будзе змешчаны тэкст з лексічнай базай да тэмы. Датэкставыя заданні дапамогуць студэнтам пашырыць лексічны запас, актывізаваць тэрміналагічную лексіку, зняць граматычныя цяжкасці, асэнсаваць спецыфічныя асаблівасці некаторых формаў слоў, сінтаксічных канструкцый і варыянтаў словаўжывання пры рабоце над перакладам у адпаведнасці з літаратурнымі і тэрміналагічнымі нормамі сучаснай мовы. Паслятэкставыя заданні прадугледжваюць абмеркаванне праблемных сітуацый па змесце тэксту, высвятленне ступені ўменняў студэнтаў узнаўляць і аналізаваць новы матэрыял. Падабраныя заданні, практыкаванні і праблемныя сітуацыі пасадзейнічаюць не толькі больш глыбокаму засваенню будучымі эканамістамі моўных фак-

таў, павышэнню ўзроўню валодання ўсім арсеналам выражальных спосабаў мовы, але і асабістаму самавыяўленню студэнтаў, фарміраванню камунікатыўнай кампетэнцыі ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці, выпрацоўцы навыкаў прафесійных зносін на роднай мове.

Формамі кантролю ведаў студэнтаў па тым ці іншым раздзеле курса беларускай мовы, узроўню практычнага валодання мовай спецыяльнасці, культуры маўлення з'яўляюцца тэксты для перакладу і пераказу, тэсты і кантрольныя работы. Як вядома, тэкст выконвае пазнавальную і выхаваўчую функцыі. Прафесійная накіраванасць навучання мае на мэце перш за ўсё выкарыстанне тэкстаў па спецыяльнасці. З гэтай мэтай у якасці матэрыялу для перакладу ўзяты ўрыўкі з тэкстаў па спецыяльных дысцыплінах: эканамічнай тэорыі, эканамічнай гісторыі, сусветнай эканомікі, менеджменце, тэорыі фінансаў, эканомікі турызму і інш. Асноўны прынцып, якім аўтары кіраваліся пры адборы тэкстаў для перакладу, — іх змястоўная каштоўнасць і напоўненасць эканамічнымі тэрмінамі. Акрамя перадачы моўных сродкаў, тэксты, пакладзеныя ў аснову навучання, маюць на мэце не толькі асвятліць сацыяльна-эканамічныя праблемы, пераўтварэнні і перспектывы Беларусі, але і даць карысную інфармацыю пра гісторыю, матэрыяльную і духоўную культуру, выдатных асоб Бацькаўшчыны, што садзейнічае пашырэнню кругагляду студэнтаў, абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці, выхаванню гарманічна развітай асобы з каштоўнасным поглядам на родную мову, заахвочванню да актыўнага карыстання ёю.

Тэставыя заданні для кантролю ведаў даюцца на апошнім этапе навучання. Выкарыстанне тэстаў дазваляе хутка ацаніць ступень засваення матэрыялу, выявіць тыповыя памылкі, скараціць час на праверку ўзроўню ведаў і навыкаў студэнтаў. Тэсты па беларускай мове ўяўляюць сабой заданні па арфаграфіі, марфалогіі, стылістыцы, якія павінны выявіць узровень моўнай і маўленчай кампетэнцыі навучэнцаў. Для праверкі ведаў па беларусазнаўству прапануюцца тэсты па гісторыі і культуры Беларусі.

Такім чынам, новая канцэпцыя комплекснай арганізацыі матэрыялу ў дапаможніку, арыгінальнасць і насычанасць заданняў і практыкаванняў дазволяць забяспечыць разнастайныя запатрабаванні вучэбнага працэсу пры навучанні ў эканамічных ВНУ беларускай мове як мове спецыяльнасці.